# НАГЛЯДНЫ І ЗАЙМАЛЬНЫ МАТЭРЫЯЛ ЯК СРОДАК АКТЫВІЗАЦЫІ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

*Варэнік Ірына Станіславаўна*

УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»

Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі – адна з самых асноўных задач настаўніка пачатковых класаў. Сярод усіх матываў вучэбнай дзейнасці самым дзейсным з'яўляецца пазнавальны інтарэс, які ўзнікае ў працэсе вучэння. Ён не толькі актывізуе разумовую дзейнасць у дадзены момант, але і накіроўвае яе да наступнага вырашэння розных задач. Устойлівая пазнавальная цікавасць фарміруецца рознымі сродкамі. Адным з іх з'яўляюцца нагляднасць и займальнасць.

Трывалыя веды – гэта вынік упартай, настойлівай працы. Арганізуючы ўрок, неабходна кіраваць дзейнасцю дзяцей так, каб кожны вучань адчуваў сілу поспеху. Поспех у працы – першарадная ўмова станаўленне асобы чалавека. Гэта ўнутраны камфорт, радасны настрой, калі справа спорыцца. Не варта забываць словы В. А. Сухамлінскага «... калі ёсць поспех – ёсць жаданне вучыцца». Асабліва важна гэта на першым этапе навучання – у пачатковай школе, дзе дзіця не ўмее пераадольваць цяжкасці, дзе няўдача прыносіць сапраўднае гора.

Асноўная крыніца разумовай працы – цікавасць, якая служыць стымулам. Гэтаму спрыяе займальны матэрыял, які дапамагае засяродзіць увагу на важных момантах. Здзіўленне – гэта яшчэ адзін момант актывізацыі дзейнасці дзяцей. Выкліканыя здзіўленне і цікавасць дапамагаюць узбудзіць разумовую дзейнасць, павялічваюць працаздольнасць.

Для дзяцей у іх жыцці вялікую ролю і значнае месца займае гульня. Гульня – вялікі свет, без якога ўсё астатняе не мае такога значэння. Яшчэ А. Фром, спецыяліст у дзіцячай псіхалогіі, у сваёй кнізе «Азбука для бацькоў» пісаў, што гэтак жа сама як даросламу чалавеку трэба працаваць, дзіцяці неабходна гуляць.

Нямецкі псіхолаг К. Грос лічыў, што гульня для дзіцяці з’яўляецца пачатковай школай паводзін, школай жыцця. У гульні яму прадстаўляецца магчымасць азнаямлення з традыцыямі паводзін людзей.

Рускі педагог К. Д. Ушынскі лічыў, што з гульняў душа дзіцяці чэрпае карысць для свайго развіцця. Гульня разглядаецца многімі

вучонымі, але ўсе шматлікія тэорыі зводзяцца да наступнага: гульня – ёсць від развівальнай дзейнасці, форма засваення сацыяльнага вопыту.

Такім чынам, гульня ў навучанні павінна заняць сваё месца. У вучэбным працэсе гульня ўключыць у сябе стварэнне асабістай прасторы навучальнай дзейнасці, у якой вучні рыхтуюцца да рашэння праблем і рэальных цяжкасцей, «пражыўшы» гэтыя сітуацыі і спосабы іх рашэння ў вучэбным працэсе.

Усё пазнанне рэчаіснасці складаецца з адчуванняў, якія прадстауляюць сабой вобразы матэрыяльнага свету, які існуе за межамі ўсведамлення і не залежыць ад яго. Аднак адчуванні не здольны самі па сабе адлюстраваць унутранрыя сувязі з'яў, іх заканамерны характар. Адлюстраванне сутнасці з'яў адбываецца ў мысленні.

Мысленне з'яўляецца не здольнасцю, а ўменнем, якое неабходна фарміраваць шляхам мэтанакіраванага і асэнсаванага навучання. Псіхолагі сцвярджаюць, што ў дзяцей малодшага школьнага ўзросту найбольш поўна і разгорнута прадстаўлены такія тыпы мыслення як: наглядна-вобразнае і наглядна-дзейснае.

Наглядна-дзейснае мысленне характарызуецца тым, што рашэнне задачы ажыцяўляецца ў наглядна ўспрымаемай сітуацыі, шляхам рэальнага дзеяння з прадметамі. У той час як наглядна-вобразнае мысленне ажыцяўляецца ў думках з дапамогай абстрактных і абагульненых вобразаў.

Такім чынам, навучальны працэс для вучняў І ступені агульнай сярэдняй адукацыі трэба будаваць абапіраючыся на псіхалагічныя асаблівасці дзяцей, развіваючы разумовыя здольнасці вучняў. Для выканання гэтай задачы ў настауніка павінен быць багаты арсенал сродкаў навучання.

Адным з такіх кампанентаў арсеналу з'яўляюцца розныя займальныя сродкі. У малодшым школьным узросце ўвага становіцца адвольнай, але яшчэ даволі доўга моцнай застаецца неадвольная ўвага дзяцей. Неадвольная ўвага не патрабуе намаганняў для таго, каб утрымаць і на працягу вызначаннага часу засяроджваць на чымсьці ўвагу, а адвольная валодае ўсімі гэтымі якасцямі. Адвольная ўвага звычайна звязанна з барацьбой матываў або заахвочванняў, наяўнасцю моцных, супраціў накіраваных і канкурыруючых адзін з адным інтарэсаў, кожны з якіх сам па сабе здольны прыцягнуць і ўтрымаць увагу. У малодшым школьным узросце ўзнікаюць элементарныя формы адвольнай увагі звязаныя з апорай на знешнія дапаможныя сродкі.

Займальнасць у навучанні – выкарыстанне розных дыдактычных сродкаў, якія абуджаюць інтарэс і ўвагу вучняў і стымулююць іх да навучання.

Займальнасць забяспечваецца яркасцю выкладання настаўнікам навучальнага матэрыялу, прыцягненне цікавых фактау, сітуацый;

выкырстаннем добра арганізаванага дэманстрацыйнага і ілюстрацыйнага матэрыялу, музычных і выяўленчых сяродкаў; незвычайных форм навучання. Займальнасць мае вялікае значэнне ў пачатковых класах, таму што ў дзяцей пераважае яшчэ непасрэдны інтарэс да канкрэтнага марэрыялу. Яшчэ з дзіцячага садка школа прымае і выкарыстоўвае гульнявыя прыёмы, якія садзейнічаюць уцягненню дзяцей ва ўмоўную, займальна-забаўляльную дзейнасць, якая валодае большым далучальным уздзеяннем, змяшчае веды, выпрацоўвае ўменні і навыкі.

Забаўляльныя прыёмы валодаюць наступнай функцыяй: у навучальным працэсе забеспячэнне эмацыянальна-прыўзнятага стану аднаўлення ведаў, якія палягчаюць працэс засваенне матэрыялу. Займальнасць параджае ў дзецях розныя эмацыянальна-псіхічныя станы, перажыванні, якія паглыбляюць пазнанне, узбуджэнне, унутраныя стымулы, схільнасць да вучэбнай працы, здымаюць напружанасць, стомленнасць, пачуццё перагрузак пры вывучэнні любых прадметаў вучэбнага плану. Навучальнае ж значэнне заключаецца ў аблягчэнні засваення дзецьмі цяжкага матэрыялу з дапамогай яскравай, эмацыянальна насычанай, захапляльнай формай яго ўзнаўлення.

Такім чынам, важнасць прымянення займальнага матэрыялу ў навучанні малодшых школьнікаў можна звесці да наступных прычын:

1. Псіхафізіялагічныя асаблівасці вучняў І ступені агульнай сярэдняй адукацыі, а менавіта тыя абставіны, што ў 6–9–гадовым узросце найбольш інтэнсіўна працякае, і па сутнасці, завяршаецца фізіялагічнае паспяванне асноўных мазгавых структур. Таму, менавіта на гэтым этапе можна найбольш эфектыўна ўздзейнічаць на фарміраванне розуму і асобы дзіцяці.
2. Магчымасць правядзення дыягностыкі разумовага і асобаснага развіцця дзяцей. Гэта абумоўлена тым, што вынікі выканання заданняў, заснаваных на займальным матэрыяле, якое выконваюць вучні, могуць быць паказчыкамі, якія даюць інфармацыю аб бягучым узроўні развіцця дзяцей.
3. Магчымасць падачы заданняў у займальнай і нагляднай форме садзейнічае згладжванню і скарачэнню адаптацыйнага перыяду. Трэба адзначыць і тое, што забаўляльны, захапляльны, наглядны характар заданняў паніжае стрэсавы фактар і дазваляе дзецям у больш поўнай меры прадэманстраваць свае сапраўдныя магчымасці і здольнасці.

Таксама вялікую ролю ў засваенні матэрыялу адыгрываюць наглядныя сродкі. Як было азначана раней, яны зніжаюць срэсавы фактар пры навучанні, але акрамя гэтага нагляднасць садзейнічае больш поўнаму і мацнейшаму засваенню матэрыялу. Таму мы лічым, што нагляднасць заслугоўвае ўвагі з боку яе значэння для навучання.

Нагляднасць у навучанні – дыдактычны прынцып, згодна якому навучанне будуецца на канкрэтных вобразах, непасрэдна ўспрынятых вучнямі. Яна ўзбагачае кола ўяўленняў дзяцей, робіць навучанне для іх больш даступным, развівае назіральнасць і мысленне, дапамагае больш глыбокаму і моцнаму засваенню вучэбнага матэрыялу.

Нагляднасць у навучанні садзейнічае фарміраванню ў вучняў разнастайных уяўленняў, якія аналізуюцца і абагульняюцца ў сувязі з вучэбнымі задачамі. Выкарыстанне наглядных дапаможнікаў не толькі для стварэння ў школьнікаў вобразных уяўленняў, але і для фарміравання мыслення, для разумення адцягненных сувязей і залежнасцей – адно з найважнейшых палажэнняў дыдактыкі, пачуцці і паняцці— розныя прыступкі суцэльнага працэсу пазнання.

Яшчэ Ян Амос Каменскі вылучыу вядомае «залатое правіла», якое прадугледжвала непасрэднае натуральнае знаемства навучэнцаў з прадметамі або ўяленнямі гэтых прадметаў. Гэта правіла абвяшчала: »...усё тое, што толькі можна ўяўляць для ўспрыняцця пачуццямі» [1, с. 20].

Нагляднасці была прысвечана ўвага і ў працах Г. Песталоццы. Адстойваючы неабходнасць нагляднасці ў навучанні, ён лічыў, што органы пачуццяў самі па сабе дастауляюць неарганізаваныя веды аб акаляючым асяроддзі. Навучанне павінна знішчыць хаатычнасць у назіраннях, размежаваць прадметы, а аднародныя і блізкія словы аб’яднаць, гэта значыць – сфарміраваць у вучняў паняцці.

Неабходнасць канкрэтна-пачуццёвай апоры ў навучанні была пераканаўча абгрунтавана К. Д. Ушынскім. Ён лічыў, што лепшым сродкам дасягнення самастойнасці дзяцей у працэсе развіцця дара слова з’яўляецца нагляднасць. Яму належыць вядомае выказванне: «Што такое нагляднае навучанне? Гэта такое навучанне, якое будуецца не на адцягненных уяўленнях і словах, а на канкрэтных вобразах, непасрэдна ўспрынятых дзіцём...» [2, с. 260]. К. Д. Ушынскі не абмяжоўваў рамкі нагляднасці толькі зрокавым успрыняццем. «Педагог, які жадае што-небудзь трывала захаваць у дзіцячай памяцці, павінен паклапаціцца аб тым, каб як мага больш органаў пачуццяў – вочы, рукі, голас, пачуццё мускульных дзеянняў і калі магчыма, нюх і смак, прынялі ўдзел у акце запамінання» [2, с.265]. Неабходна, каб прадмет непасрэдна ўспрымаўся дзіцём і каб пад кіраўніцтвам настаўніка «...пачуцці пераўтвараліся ў паняцці, з паняццяў складваліся думкі, а думкі ўвасабіліся ў словах» [2, с. 25].

Па меркаванні А. М. Лявонцьева, нагляднасць можа служыць для рашэння спецыяльных педагагічных задач. Раскрыцця вызначальных заканамернасцей падвядзення да навуковых абагульненняў. Другой задачы адпавядае толькі той наглядны матэрыял, які «служыць як бы знешняй апорай унутраных дзеянняў, здзяйсняемых вучнямі пад кіраўніцтвам

настаўніка ў працэсе авалодвання ведамі» [3, с. 231]. У стварэнні апор для ўнутраных (мысліцельных) дзеянняў А. М. Лявонцьеў бачыць псіхалагічную функцыю нагляднасці, якая аблягчае працэс абагульнення.

Пытанне выкарыстання сродкаў нагляднасці ў навучанні для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў, набывае асаблівую вастрыню ў нашы дні.

Вядома, што пры непасрэдным уздзеянні нейкага аб'екту на органы пачуццяў чалавека ў яго свядомасці ўзнікае вобраз уяўлення гэтага аб'екта.

Стварэнне такога вобразу – гэта рашэнне чалавекам пазнавальнай задачы, у якой поруч з пачуццём удзельнічае памяць і мысленне. Нагляднасць вобразу ўспрыняцця залежыць ад таго, на колькі ён звычайны і зразумелы чалавеку. Успрымаемы аб'ект валодае якасцю пачуццёвасці, таму што ён уздзейнічае на органы пачуццяў, але яго вобраз з'яўляецца наглядным толькі ў тым выпадку, калі чалавек аналізуе і асэнсоўвае аб'ект , суадносіць аб'ект з ужо наяўнымі ў чалавека ведамі. Калі створаны ўяўленнем вобраз ненагладны, ён не выклікае інтарэсу і не запамінаецца, наглядны вобраз захоўваецца ў памяці як вобраз-прадстаўленне.

Такім чынам, наглядны вобраз узнікае не сам па сабе, а ў выніку актыўнай пазнавальнай дзейнасці чалавека. Нагляднасць жа як прынцып навучання прадугледжвае стварэнне ў вучняў наглядных уяўленняў у выглядзе псіхічных вобразаў вывучаемага аб'екту або дзеяння, з мэтай фарміравання ў іх ведаў, уменняў, навыкаў.

Такім чынам, з вышэй адзначанага можна зрабіць вывад пра тое, што выкарыстанне наглядных сродкаў навучання і разнастайнага займальнага матэрыялу пры вывучэнні вучнямі I ступені агульнай сярэдняй адукацыі беларускай мовы прадыктавана псіхалагічным аспектам развіцця дзяцей 6-9-гадовага ўзросту, развіцця іх псіхічных функцый, асаблівасцямі ўспрымання, памяці і мыслення. Акрамя гэтага, выкарыстанне даных сродкаў скарачае адаптацыйны перыяд у малодшых школьнікаў і актывізуе іх пазнавальную дзейнасць.

## Спіс літаратуры

1. Педагогическая энциклопедия в 4 томах. – М. : Сов. энциклопедия, 1968. – Т.4. – 911 с.

2. Ушинский, К. Д. Собрание сочинений в 8 томах / К. Д. Ушинский. – М. : Просвещение, 1950. – Т.8. – 776 с.

3. Леонтьев, А. Н. Избранные психологические произведения / А. Н. Леонтьев. — М., 1983. — Т.1. — 360 с.